Усходні гараскоп на наступны тыдзень

АВЕН. Старанна аналізуйце падзеі, што адбываюцца, абапіраючыся на жыццёвы вопыт і логіку. Не ідзіце на павадку ў чужога меркавання. Паспрабуйце ўстрымацца ад адкрытай крытыкі сяброў і калег. Вы таксама зусім не ідэал. Напярэдзе замаячыць штосьці новенькае, яно абяцае сапраўдны поспех і паляпшэнне вашага фінансавага становішча. Вашы планы на выхадныя могуць адрозніцца ад планаў членаў вашай сям'і.

ЦЯЛЕЦ. Тыдзень абяцае прынесці пазітыўныя тэндэнцыі ў многіх справах. Аднак пакуль свае планы і намеры лепш захаваць у тайне, калі вы зацікаўлены ў іх ажыццяўленні. Не выключана, што давядзецца вытрымаць нападкі нядобразычліўцаў. Сярэдзіна тыдня будзе напоўнена сустрэчамі, перамовамі і бясконцымі справамі. У суботу паспрабуйце выбрацца куды-небудзь у госці ці запрасіце каго-небудзь да сябе, цёплыя зносіны вам забяспечаны.

БЛІЗНЯТЫ. На гэтым тыдні вас чакаюць прыемныя падзеі, любоўныя прызнанні і спатканні. Душэўная праца, хоць і непрыкметная, таксама прыносіць свой плён, развівайце ўнутраны свет. Пажадана не плыць супраць цячэння, а злавіць хвалю ўдачы. І тады можна будаваць напалеонаўскія планы. Многія ажыццявяцца.

РАК. На гэтым тыдні пажадана асцерагацца неабдуманых слоў і рашэнняў. Паспрабуйце не ісці на павадку ў эмоцый. Тое, што сёння злуе і раздражняе, заўтра выкліча толькі ўсмешку. Парадуйцеся поспехам блізкіх людзей, арганізуйце сямейную вячэру. Адкладзіце ў пятніцу дробныя справы, якія вас раздражняюць, і займіцеся рашэннем больш важных праблем. Выхадныя прысвяціце адпачынку.

ЛЕЎ. Пачатак тыдня спрыяльны для кар'еры і вырашэння важных спраў. Могуць узнікнуць складанасці ў дзелавой сферы, але адступаць нельга, у вас хопіць сіл дабрацца да вяршыні поспеху. Не варта ўпарціцца, адстойваючы свой аўтарытэт і кампетэнтнасць, лепш прыслухацца да парад калег і начальства. Другую палову тыдня пажадана прысвяціць адпачынку. У суботу магчыма сур'ёзная размова са сваякамі, праявіце тактоўнасць і не апярэджвайце падзеі.

ДЗЕВА. Магчымасці, якія адкрываюцца перад вамі, радуюць, але не варта дэманстраваць перавагу перад калегамі. У аўторак вам, падобна, прыйдзецца мірыць блізкіх сяброў, якія сур'ёзна пасварыліся. У канцы тыдня сустрэча з новымі, цікавымі людзьмі дапаможа расслабіцца і дазволіць павесяліцца ад душы, а вам гэта так неабходна. Тыдзень спрыяльны для вырашэння хатніх і сямейных праблем.

ШАЛІ. Могуць паступіць нечаканыя прапановы, не спяшайцеся казаць «так». Падзеі на рабоце будуць досыць непрадказальныя. Праявіце ініцыятыву і актыўнасць у асабістым жыцці. Вас чакае дастаткова цяжкая праца, але намаганні будуць шчодра ўзнагароджаныя. Чацвер — спрыяльны дзень для пачатку доўгатэрміновых праектаў, вам па плячы самыя складаныя задачы. Аднак вы можаце стаміцца, вырашаючы чужыя праблемы. Пакіньце сілы для сваіх.

СКАРПІЁН. Тыдзень будзе паспяховы і прыбытковы. Ён ідэальна падыходзіць як для адпачынку, так і для працы. Аднак, чым бы вы ні займаліся, не забывайце пра каханага чалавека, ён натхніць і пацешыць. Не варта рабіць штосьці праз сілу — усё роўна не атрымаецца, лепш і не брацца, калі займацца гэтым не хочацца.

СТРАЛЕЦ. На гэтым тыдні вам спатрэбяцца такія якасці, як прадбачлівасць і ўменне імгненна прымаць рашэнні. У панядзелак адносіны з начальствам палепшацца, вам могуць даверыць складаны праект. Чацвер — удалы дзень для вучобы, лекцый, майстар-класаў. У пятніцу дзелавыя перамовы могуць стаць вельмі плённымі.

КАЗЯРОГ. Зносіны і сумесныя праекты з дзелавымі партнёрамі могуць займаць большую частку вашага часу. Званкі, лавіна інфармацыі, перамовы — усё гэта запатрабуе дакладнага і паслядоўнага плана дзеянняў, інакш можаце не разлічыць свае сілы, а перагрузкі зусім непатрэбныя. У выхадныя арганізуйце сустрэчу з даўнімі сябрамі і адпачніце ў добрай кампаніі.

ВАДАЛІЙ. У аўторак не выключаны сваркі і канфлікты, вы многае будзеце ўспрымаць у штыкі. Паспрабуйце ўсё ж такі наладзіць адносіны з калегамі, гэта створыць станоўчую атмасферу вакол вас. Паспрабуйце быць сумленнымі з сабой і навакольнымі, лепш не прыхарошваць падзеі, што адбываюцца. Субота абяцае прынесці цікавыя прапановы. У нядзелю купіце абноўку да свята.

РЫБЫ. На гэтым тыдні самы час высветліць сутнасць назапашаных у вас праблем і прэтэнзій з боку начальства. Варта падумаць пра свае перспектывы і, вызначыўшыся, пачынаць спакойна дзейнічаць. У вас ёсць рэальны шанц стаць сапраўдным гаспадаром становішча. Творчы настрой у чацвер дазволіць здзівіць свежымі ідэямі сяброў і калег. У сярэдзіне тыдня адносіны з блізкімі людзьмі могуць аказацца не такімі ўжо бясхмарнымі, але да выхадных хмары рассеюцца, і вы выдатна праведзяце час у сямейным коле.

З нагоды

Павіншаваць альма-матэр!

Марафон відэавіншаванняў стартуе да стагоддзя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

На афіцыйных інфармацыйных рэсурсах ВНУ на працягу года будзе размешчана сто святочных зваротаў вядомых прадстаўнікоў БДУ. Гэтая лічба сімвалізуе юбілейную дату.

Шматтысячны калектыў ВНУ, а таксама 185-тысячную супольнасць выпускнікоў БДУ ў гэтым марафоне прадставяць кіраўнікі, дэканы, прафесары і навукоўцы. Відэавіншаванні запішуць таксама лідары маладзёжных арганізацый, студэнты, якія дасягнулі поспехаў у вучэбнай, навукова-даследчай дзейнасці, пераможцы міжнародных і рэспубліканскіх спаборніцтваў і конкурсаў, выпускнікі розных гадоў.

Адкрыў віншавальны марафон выпускнік БДУ і прафесар з самым працяглым стажам работы Анатоль Антаневіч. А завершыць віншавальны марафон рэктар БДУ Андрэй Кароль. Свае пажаданні супрацоўнікам і студэнтам ВНУ ён накіруе напярэдадні ўрачыстага пасяджэння Савета з нагоды святкавання 100-годдзя БДУ, якое адбудзецца 30 кастрычніка.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Даты. Падзеі. Людзі

27 ЛЮТАГА

У краіне

1891 год — нарадзіўся (вёска Вузляны Пухавіцкага раёна) Давід Сарноў, амерыканскі сувязіст, адзін з заснавальнікаў радыё- і тэлевяшчання ў ЗША. Ганаровы член Калумбійскага, Нью-Ёркскага і іншых універсітэтаў.

1906 год — нарадзілася Рыта (Рэвека) Веньямінаўна Млодак, спявачка, народная артыстка Беларусі, з 1931-га — салістка Беларускага радыёкамітэта, у 1933—1959 гадах (з перапынкам) — салістка Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі.

2001 год — 27 лютага — 2 сакавіка ў Мінску з удзелам 200 фірмаў з больш чым 20 краін прайшла міжнародная выстаўка «Ахова здароўя Беларусі».

У свеце

1831 год — нарадзіўся Мікалай Мікалаевіч Ге, рускі мастак, адзін з заснавальнікаў Таварыства перасоўнікаў. Адметны майстар гістарычнага жывапісу, партрэта, карцін на рэлігійна-міфалагічныя сюжэты (цыкл пра пакуты Хрыста, партрэты Талстога і Герцэна, карціна «Пётр I дапытвае царэвіча Аляксея»).

1856 год — нарадзіўся Матыа Батыстыні, італьянскі спявак, выдатны майстар бельканта, творчасць якога стала адной з выдатных вяршыняў вакальнага мастацтва другой паловы XIX стагоддзя.

Так гаварыў...

ГЕНРЫ ФІЛДЫНГ:

«Дрэнныя кнігі могуць гэтак жа сапсаваць нас, як і дрэнныя знаёмыя».

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.02	18.43	10.41
Віцебск —	7.54	18.30	10.36
Магілёў —	7.53	18.33	10.40
Гомель —	7.47	18.32	10.45
Гродна —	8.17	18.59	10.42
Брэст —	8.15	19.01	10.46

Месяц

Поўня ў 11.17.
Месяц у сузор'і Дзевы.

Імяніны

Пр. *Абрама, Аўксенція, Ісака, Кірылы, Міхаіла, Фёдара.*
К. *Анастасіі, Лівіі, Васіля, Віктара, Леанарда, Юльяна.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЗАЎТРА



УСМІХНЕМСЯ

Каб Макара не звольнілі з работы і плацілі прыстойную зарплату, ён узяў свайго начальніка паручыцелем па крэдыце.

— Максім, ты шчаслівы?
— А што рабіць...

Даішнік спыняе машыну:
— Пілі?
— Не.
— А што такое, нешта здарылася?
— Ты куды?
— У магазін.
— Грошы ўзяла?
— Так.
— Глядзі не траць!

— Што такое шчасце?
— Шчасце — гэта калі ўсе табе зайздросцяць, а нашкодзіць не могуць.

З прыгожай круглай датай, з юбілеем, шчыра віншуем актыўную аўтарку і падпісчыцу «Звязды» спадарыню Зою НАВАЕНКУ! Зычым вам, шаноўная Зоя Максімаўна, моцнага здароўя, бадзёрасці, новых творчых поспехаў:

Каб зоркі падалі ў руку!
Каб ува ўсім спрыяла неба!
І каб хапала ў кашальку
На ўсе надзённыя патрэбы!

Звяздоўцы.

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 2 ад 17 лютага 2009 года, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

АДРАС: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 311 17 13 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 311 17 44, маркетынгу — 263 66 73, бухгалтэрыі — 311 17 16.

прыём рэкламы тэл./факс: 311 17 27,
e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

www.zviazda.by

e-mail: info@zviazda.by (для зваротаў): zvarot@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, праспект Незалежнасці, 79/1. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 14.804. Індэкс 63850. Зак. № 367. Нумар падпісаны ў 19.30 26 лютага 2021 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12